Наша спадчына

# АРХІЎ ПАД НЯБЕСНАЙ АПЕКАЙ

**Касцёл у гонар святога Іосіфа, што стаіць на цяперашняй вуліцы Кірылы і Мяфодзія, з'яўляецца адным з самых старажытных будынкаў Мінска. Праўда, па прамым прызначэнні ён не выкарыстоўваецца аж з 1862 года, а з 1872-га тут размяшчаюцца рознага кшталту архівы. У 1991 годзе менавіта сюды пераехаў Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. Зусім нядаўна ўстанова адзначыла сваё 55-годдзе. З гэтай нагоды карэспандэнты «Звязды» сустрэліся з дырэктарам архіва-музея Ганнай ЗАПАРТЫКАЙ і даведаліся, дзе сёння захоўваецца гальштук Максіма Гарэцкага і кнігі Уладзіміра Караткевіча.**



...З цяжкасцю падымаемся па лесвіцы на апошні, пяты, паверх былога касцёла. У калідорах і на лесвічных пралётах міжволі спыняемся ля невялічкай экспазіцыі — на стэндах размешчаны копіі дакументаў, якія датычацца жыцця беларускіх класікаў літаратуры, выяўленчага мастацтва, музыкі, акцёраў кіно і тэатра. Некаторыя са здымкаў добра знаёмыя па школьных падручніках. З акна адкрываецца цудоўны від на гістарычны цэнтр горада — былы Верхні рынак. Паўсюль адчуваецца подых часу, нават велізарнае акно, хоць і зробленае ўжо ў XX стагоддзі, выглядае настолькі незвычайна, што і не верыцца ў яго «неарыгінальнасць».

**«Эпоха заўсёды адбіваецца на прыватнай перапісцы, асабістых занатоўках. І, калі вывучаеш гэтыя крыніцы, можаш адшукаць шмат унікальнай і незвычайнай інфармацыі пра, здавалася б, асобу ўсім добра вядомую».**

## ПАПЯРОВЫЯ СВЕДЧАННІ ЭПОХІ

— Спецыфіка нашага архіва ў тым, што ён камплектуецца ў першую чаргу дакументамі асабістага паходжання, такіх у нас 87 працэнтаў, — заўважае Ганна Запартыка. — У асноўным гаворка ідзе пра рукапісы, асабістую перапіску, дзённікі, фотаздымкі — усё, што стваралася на паперы. Нямала ў нас і архіўных фондаў беларускіх часопісаў і газет. Мы займаемся камплектаваннем такіх дакументаў, іх сістэматызацыяй, размяшчэннем і, вядома, далейшым выкарыстаннем.

Па словах дырэктара, архіў-музей пастаянна папаўняецца новымі фондамі, цяпер іх тут больш за 500, а гэта звыш 100 тысяч адзінак захоўвання, у першую чаргу асабістых дакументаў, напрыклад, лістоў, дзённікаў. Але нямала тут і папер афіцыйнага кшталту — арганізацыйных, справаводных. Напрыклад, у фондах кінастудыі «Беларусьфільм» гэта могуць быць сцэнарыі, запісы музычнага суправаджэння...

— Вартасць фондаў асабістага паходжання часам проста неверагодная, — лічыць Ганна Запартыка. — Калі гэта фонд якога-небудзь пісьменніка, то ў асабістых дакументах могуць уздымацца тыя праблемы, пра якія амаль нічога не было сказана ў творчасці. У прыватнасці, закранаюцца палітычныя, эканамічныя пытанні. Эпоха заўсёды адбіваецца на прыватнай перапісцы, асабістых занатоўках. І, калі вывучаеш гэтыя крыніцы, можаш адшукаць шмат унікальнай і незвычайнай інфармацыі пра, здавалася б, асобу ўсім добра вядомую. Міхась Лынькоў, напрыклад, страціў падчас вайны сваю сям'ю, шмат перапісваўся, шукаючы родных. І ў гэтых лістах ён расказваў пра многія падзеі свайго жыцця, якія больш нідзе не згадваюцца. Многія выпадкі вельмі красамоўна характарызуюць не столькі яго самога, колькі час, у якім творца жыў.

## ПАМІЖ АРХІВАМ І МУЗЕЕМ

Хто ж найперш карыстаецца такой інфармацыяй? Вядома, у першую чаргу — навукоўцы. Па словах Ганны Запартыкі, гэта даследчыкі-філолагі: студэнты, аспіранты, дактары навук. Акрамя таго, у чытальнай зале архіва-музея стварыліся шматлікія зборы твораў беларускіх класікаў: Янкі Купалы, Якуба Коласа, Івана Навуменкі, Івана Шамякіна, Уладзіміра Караткевіча. Але прыйсці ў архіў і з простай цікаўнасці пагартаць лісты і дзённікі славутых беларусаў не атрымаецца — для таго, каб трапіць у чытальную залу, трэба напісаць заяву, у якой будзе акрэслена задача прыходу ў архіў.



Фота Надзеі БУЖАН.

**«Самае каштоўнае хавалася за вокладкай — там было знойдзена каля дзесяці развітальных аўтографаў паўстанцаў 1863—1864 гадоў».**

Аб неабмежаваным выкарыстанні архіўных фондаў размова таксама не ідзе. Беларускае заканадаўства ахоўвае тайну асабістай перапіскі, а таму большасць дакументаў не можа быць апублікавана да канца тэрміну ў 75 гадоў з часу стварэння. Для такой публікацыі патрэбны спецыяльны дазвол уласніка — родных аўтара або самога архіва. Тым не менш, з большасцю архіўных дакументаў можна працаваць без ніякіх абмежаванняў.

Цікавым можа быць і пытанне незвычайнага статусу ўстановы — архіва-музея.

— Тое, што мы не толькі архіў, а яшчэ і музей, тлумачыцца проста. У нас вельмі вялікая колькасць дакументаў, якія могуць быць выкарыстаны ў музейных экспазіцыях, — тлумачыць Ганна Запартыка. — Калі, умоўна кажучы, будзе вырашана стварыць музей Максім Танка, дакументы з нашых фондаў змогуць стаць для яго асновай. Вельмі часта мы дапамагаем фарміраваць экспазіцыі часовым і пераносным выстаўкам. Акрамя таго, у нас захоўваюцца не толькі паперы, але і асабістыя рэчы некаторых дзеячаў літаратуры і мастацтва: друкарскія машынкі, ручкі, узнагароды, кнігі. Зразумела, іх не так шмат, бо мы не можам усё прыняць, але яны ёсць. Напрыклад, асабістыя рэчы Максіма Гарэцкага, Адама Бабарэкі, Канстанцыі Буйло, сям'і Максіма Багдановіча і многіх іншых. Зразумела, што яны не менш каштоўныя для грамадства, бо заўсёды цікава пабачыць гальштук Гарэцкага, шахматы, у якія гуляў Бабарэка, кнігі, якія чытаў Караткевіч...

## ДОЎГАЯ ДАРОГА ДАДОМУ

Гісторыя асобных дакументаў архіва не можа не ўражваць. Напрыклад, арыгінальны рукапіс апошняй прыжыццёвай паэмы Уладзіміра Жылкі «Тэстамент» быў уратаваны Яўхімам Кіпелем, разам з якім паэт быў сасланы ў Вяцкую вобласць па вядомай справе «Саюза вызвалення Беларусі». Рукапіс быў спачатку перавезены ў Мінск, а ў 1944 годзе апынуўся на Захадзе, дзе і захоўваўся беларускімі эмігрантамі. Толькі летась аўтограф паэмы вярнуўся ў Беларусь.

**«Здымак знайшоўся, але... без адной асобы: цэнзары банальна зацерлі на фатаграфіі Антона Адамовіча, які ў часе вайны эміграваў на Захад і актыўна крытыкаваў бальшавікоў».**

— Пэўна, самы запатрабаваны, самы ўнікальны і самы дарагі — гэта фонд №3 віленскага Беларускага гісторыка-этнаграфічнага музея Івана Луцкевіча, які расфарміравалі ў пасляваенны час, — распавядае Ганна Запартыка. — У ім змяшчаюцца каштоўныя дакументы па гісторыі беларускага кнігадрукавання пачатку першай чвэрці мінулага стагоддзя, дакументы легендарнай суполкі «Загляне сонца і ў наша аконца», шматлікіх выдавецкіх таварыстваў. Там жа захоўваюцца паперы беларускіх партый і рухаў, грамадскіх суполак, універсітэтаў таго ж перыяду, архіў газеты «Наша ніва». Вядома, ёсць тут і асабістыя дакументы, напрыклад, Цёткі, братоў Луцкевічаў, Браніслава Тарашкевіча, Клаўдзія Дуж-Душэўскага. Яшчэ адзін збор, які я адзначыла б, — фонд беларускага гісторыка, археолага і мовазнаўцы Івана Грыгаровіча. Гісторыя гэтага архіва таксама незвычайная: разам са сваім гаспадаром усе дакументы ў 1820-я гады пераехалі ў Расію, потым невядомымі нам шляхамі апынуліся ў Краснаярску, у калекцыі Юдзіна. І толькі ў 1950-я частка архіва вярнулася ў Беларусь.

Каштоўныя дакументы, што належалі грамадска-палітычнаму дзеячу Антону Неканда-Трэпку, які даводзіўся пляменнікам паэту Янку Лучыну, вярнуліся на радзіму ад яго польскіх сваякоў. З фонду беларускага літаратуразнаўцы Лукаша Бэндэ сюды трапілі некаторыя дакументы Браніслава Эпімах-Шыпілы, у прыватнасці яго славутая рукапісная беларуская хрэстаматыя, дзякуючы якой захаваліся многія помнікі беларускай літаратуры XIX стагоддзя. Архівы літаратурнага аб'яднання «Маладняк», дакументы «ўзвышэнцаў» — гэты спіс можна доўжыць, здаецца, бясконца... Цікавыя дэталі з'яўляюцца там, дзе іх зусім не чакаеш.

## ЛІТАРАТУРНЫ «ФОТАШОП»

Славуты групавы фотаздымак сяброў літаратурнага аб'яднання «Узвышша». На адной картачцы, зробленай у 1929 годзе ў Мінску, легендарныя асобы: Антон Адамовіч, Адам Бабарэка, Змітрок Бядуля, Пятро Глебка, Уладзімір Дубоўка, Уладзімір Жылка, Кандрат Крапіва, Кузьма Чорны, Максім Лужанін...

— Гэты здымак трапіў да нас гадоў 15 таму праз сям'ю Адама Бабарэкі, — узгадвае Ганна Вячаславаўна. — У нашым архіве тады адбываліся чытанні паэтаў-узвышэнцаў, і я падрыхтавала артыкул для газеты «Літаратура і мастацтва». Дадала гэты фотаздымак, нават падпісала: «Друкуецца ўпершыню». Але ж не пазбавілася адчування таго, што фота я недзе бачыла. З гэтай думкай прыехала дадому, і ў хатняй бібліятэцы вока спынілася на зборы твораў Кандрата Крапівы. Уявіце: я гартала яго яшчэ ў студэнцкія часы, але ж у падсвядомасці неяк адклалася... Здымак знайшоўся, але... без адной асобы: цэнзары банальна зацерлі на фатаграфіі Антона Адамовіча, які ў часе вайны эміграваў на Захад і актыўна крытыкаваў бальшавікоў.

Самы стары дакумент ва ўсім архіве — рукапісны каталіцкі малітоўнік другой паловы XVIII стагоддзя. З тых жа, што маюць дачыненне да гісторыі літаратуры, найбольшым узростам можа пахваліцца запісная кніжка сям'і Каруся Каганца, якая адносіцца да 1813 года. Яе набыў дзед паэта, у нататніку можна знайсці гаспадарчыя запісы сям'і. Але, пэўна, самае каштоўнае хавалася за вокладкай — там было знойдзена каля дзесяці развітальных аўтографаў паўстанцаў 1863—1864 гадоў.

**«Заўсёды цікава пабачыць гальштук Гарэцкага, шахматы, у якія гуляў Бабарэка, кнігі, якія чытаў Караткевіч...»**

Яшчэ адна незвычайная дэталь — бацька Каруся Каганца разам з іншымі інсургентамі адбываў пакаранне... у гэтым жа будынку. Справа ў тым, што ў кляштары бернардзінцаў, які прымыкае да касцёла, у 1860-я размяшчалася перасыльная турма. Саму запісную кніжку напачатку 1990-х у архіў перадала дачка паэта.

## РУКАПІСЫ НЕ ГАРАЦЬ?

...Ізноў нас вядзе лесвіца, на гэты раз уніз — у сэрца архіва. Ганна Вячаславаўна паказвае, як захоўваецца ўся гэта велізарная спадчына — рады стэлажоў цягнуцца, здаецца, у бясконцасць, на скрынях і папках — адным толькі архівістам зразумелыя лічбы і шыфры. Галоўны працоўны інструмент тут — тэрмометр, на якім 17 градусаў. Вільготнасць — 55 працэнтаў. У такіх умовах папера амаль не псуецца. Але ж час усё роўна можа ўзяць сваё?

— Мы паступова праводзім алічбоўку фондаў, — распавядае Ганна Запартыка. — Пачынаем з самых каштоўных, унікальных дакументаў, а таксама з тых, што бяруць у карыстанне найчасцей. Таму многія цяпер працуюць ужо з копіямі папер. Усяго вылучана 18 тысяч самых важных адзінак, якія трэба адсканаваць найперш. Думаю, каля дзясятай часткі з іх ужо прайшлі працэдуру.

***

Некалькі гадоў назад прагучала ідэя вяртання касцёла-архіва вернікам. Але новага будынка для архіва-музея пакуль няма і не плануецца, таму ўсё застаецца на сваіх месцах. Можа, яно і да лепшага, каб адна з галоўных скарбніц беларускай літаратуры і мастацтва заставалася там, дзе ёсць, — пад апекай нябесных заступнікаў?

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by